вёсак Сіліна Поле, Старая Каменка. Помнікі архітэктуры: Ляснянскі мемар. комплекс, парк у в. Свенск (пач. 20 ст.). Помнікі гісторыі: брацкія магілы сав. воінаў і партызан у вёсках Базарычы, Аляксандраўка 1, Бахань, Бязуевічы, Вял. Зімніца, Гайшын, Гіжэнка, Іванішчавічы, Кульшычы, Лапацічы, Лясная, Ляцягі, Новая Слабада, Пацяраеўка, Рабавічы, Ралінаўка, Рагі, Рудня, Рэкта, Свенск, Слаўня, Старая Каменка, Усохі, Хохарава, Чарнякоўка, Чырвоны Усход, б. вёсках Кулікоўка 1 і 2, Старынка, Красная Слабада; брацкія магілы сав. воінаў у вёсках Закрупец, Любаны, Целяшы. Магілы ахвяр фашызму ў вёсках Новая Слабада, Пацяраеўка. Помнікі землякам у вёсках Аляксандраўка, Бахань, Бярозаўка, Вял. Зімніца, Гайшын, Гіжэнка, Кулікоўка 1, Кульшычы, Лапацічы, Па[illegible]ука, Рагі, Ржаўка 1, Рэкта, Свенск, Целяшы, Чарнякоўка, Чырвоны Усход. На б. хутары Казлоўскі (Казловічы) нарадзіўся кампазітар В.А.Казлоўскі (1757—1831), аўтар 1-га гімна Рас. імперыі, у в. Хварасцяны — бел. літаратуразнавец, крытык М.Р.Ларчанка (1907—81), у в. Гайшын — бел. паэт К.Кірэенка (1918—88), у в. Улукі — бел. геолаг А.П.Нядзвецкі (1902—1992), у б. в. Людкаў — бел. гісторык І.Я.Марчанка (1923—97), у в. Сычын — бел. пісьменнік М.Стральцоў (1937—87).

**СЛО́ВА** ў г р а м а т ы ц ы, асноўная структурна-семантычная адзінка мовы, якая служыць для наймення элементаў рэчаіснасці (прадметаў, уласцівасцей, з'яў, адносін і інш.) і валодае шэрагам семантычных, фанетычных і граматычных прыкмет, характэрных для кожнай мовы. Па семантычнай прыкмеце вылучаюць С. адназначныя («ганчар», «знагарнуць») і шматзначныя («зямля», «хлеб»), свабодныя («мазанка», «чароўны») і фразеалагічна звязаныя («бібікі — бібікі біць», «блынды — блынды правіць»). Па способе наміначыі вылучаюць С. знаменальныя і службовыя, а таксама выклічнікі, па фанетычным крытэрыі — аднанаціскныя («ланцуг», «прарок»), ненаціскныя (службовыя) і шматнаціскныя («збожжасховішча», «двухбаковы»). У граматычных адносінах адрозніваюць С. зменныя (назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, дзеясловы) і нязменныя (прыслоўі, мадальныя словы, службовыя словы, выклічнікі), вытворныя («касцельны», «веянне») і невытворныя («хваля», «піць»). У структурных адносінах С. складаецца з марфем, ад якіх адрозніваецца аўтаномнасцю і свабодным узнаўленнем у мове, з'яўляецца матэрыялам для канструявання сінтаксічных адзінак. Мае граматычнае і лексічнае значэнні. Граматычнае значэнне характэрна для цэлага класа С. (напр., катэгорыі роду, ліку, склону — для назоўнікаў), лексічнае значэнне з'яўляецца індывід. і ўласціва канкрэтнаму С. («імбрычак» — чайнік для заваркі чаю; «фурман» — чалавек, які кіруе коньмі ў запрэжанай павозцы, вазак). Аб'ядноўваючы ў сабе абодва значэнні, С. належыць да пэўнай часціны мовы і прадстаўляе сабой сукупнасць усіх граматычных форм («шалік», «шаліка», «шаліку», «шалікам»). Слоўнікавы склад пэўнай мовы з'яўляецца яго *лексікай*.

*Д.В.Дзятко.*

**«СЛО́ВА АБ ПАЛКУ́ ІГАРАВЫМ»,** «С л о в а п р а п а х о д І г а р а в ы», «С л о в а а б п а х о д з е І г а р а в ы м», помнік літаратуры Кіеўскай Русі 12 ст. Узнік на аснове агульнай культуры рус., бел. і ўкр. народаў. Створаны невядомым аўтарам, верагодна, у канцы 1185—87 у Кіеве. У аснове сюжэта — расказ пра няўдалы паход на палаўцаў у 1185 ноўгарад-северскага кн. Ігара Святаславіча (1151—1202), які скончыўся разгромам рус. войска і паланеннем Ігара. Прычыны няўдач, аслаблення ваен.-паліт. магутнасці Русі аўтар бачыў у абставінах, якія склаліся на ўсх.-слав. землях ва ўмовах феадальнай раздробленасці, у княжацкіх міжусобіцах, адсутнасці згоды і адзінства, няспынных нападах знешніх ворагаў. Змест і вобразы паэмы цесна звязаны з рэальна-гіст. жыццём сярэдневяковай Русі і сведчаць пра шырокі кругагляд яе аўтара, пра яго глыбокую дасведчанасць у складанай гісторыі ўсх.-слав. зямель і княстваў, якую ён паказаў з аб'ектыўнасцю і дакладнасцю. «Слова» вылучаецца жанравай складанасцю; эмацыянальная стыхія ўзмацняецца блізкім да нар. галашэнняў «плачам Яраслаўны», «залатым словам» Святаслава, паэт. апісаннем уцёкаў Ігара з палону і напружанымі батальнымі сцэнамі. Твор — каштоўная крыніца пазнання далёкай мінуўшчыны ўсх. славян, у т.л. Беларусі. Яркай гіст. асобай, мудрым і дзейным валадаром, князем-чарадзеем і адначасова несправядліва пакрыўджаным, няшчасным чалавекам паказаны ў «Слове» легендарны Усяслаў Брачыславіч. Уражвае сваім трагізмам і трапнасцю маст. апісання бітва на Нямізе 1067. Значная ўвага, нададзеная ў паэме Полацку і яго мінуламу, сведчыць пра важную ролю Полацкага княства ў гісторыі ўсх. славян, пра яго цесныя і даўнія ўзаемасувязі з Кіеўскай Руссю. «Слова» — своеасаблівая энцыклапедыя Стараж. Русі, багатая крыніца пазнання тагачасных светапогляду, культуры і побыту. Паэма паўплывала на л-ры ўсх.-слав. народаў, сцвярджаючы традыцыі народнасці і патрыятызму. «Слова» адкрыў у пач. 1790-х гг. рус. гісторык А.Мусін-Пушкін у рукапісе 16 ст., які зберагаўся у Яраслаўлі і загінуў у Маскве ў 1812. Упершыню твор апублікаваны ў 1800. У ліку першых даследчыкаў «Слова» быў З.Даленга-Хадакоўскі. У 1910 паэт. пераклад урыўка паэмы пра смерць полацкага кн. Ізяслава зрабіў М.Багдановіч. Поўныя празаічныя пераклады на бел. мову належаць Я.Купалу (1919) і М.Гарэцкаму (1922). Сярод апошніх бел. перакладаў — вольны пераклад Я.Крупенькі (нап. 1966—79, апубл. часткова ў 1976, цалкам у 1994), дакладны і паэт. пераклад Р.Барадуліна (1984—85), паэт. пераклады В.І.Дарашкевіча (1985, апубл. ў 1989) і І.Г.Чыгрынава (1991).